На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 114 (466)
Субота, 27 чэрвеня 1998 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Народная Воля

Кошт: у кіёсках і крамах — 3000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.



Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	4.20	21.43
Магілёў	4.28	21.34
Гомель	4.33	21.23
Мінск	4.38	21.45
Гродна	4.55	21.59
Брэст	5.06	21.51

Маладзік 24 чэрвеня.

Незлобивые заметки

Семен БУКЧИН

О правах каких "человеков" толковали в Национальном собрании?

Плакат ООН освящал состоявшиеся в Доме правительства парламентские слушания по правам человека в Беларуси. Замечательная надпись была на нем: "Все права человека для всех".

Увы! — прекрасный этот принцип никак не сочетался с самим характером "мероприятия", которому больше подошел бы лозунг из серии "Наш ответ Чемберлену". "Слушания" до боли напоминали уже подзабытые идеологические пленумы то ли ЦК КПСС, то ли ЦК КПБ. Сценарий был расписан четко. Права человека в Беларуси в международном аспекте — об этом докладывал, естественно, г-н Антонович. Соблюдение тех же прав в социальной, экономической сфере — здесь блистал красноречием г-н Мясникович. Запугивал вражескими и экстремистскими происками под прикрытием борьбы за все те же права и призывал к бдительности, натурально, г-н Шейман.

Ну и далее все по порядку: председатель Конституционного суда, Генеральный прокурор, депутаты и другие достойные люди... Общий глас склонялся к тому, что да, конечно, у нас еще есть "отдельные недостатки" в этой важнейшей гуманитарной сфере, но, в целом, Беларусь если и не "впереди планеты всей" по соблюдению прав человека, то в первых рядах несомненно. Дискуссии не получилось, да она и не была запланирована, но г-ну Гончарику, как профсоюзному боссу, позволили сказать о правах трудящихся на достойную зарплату. Это можно, это допускается... Ну а г-н Кулаковский забрался на невероятную либеральную высоту: подумать только, согласно его сообщению, у нас будет уполномоченный по правам человека! То-то заживем!

Теперь все граждане, избитые на митингах и демонстрациях "моей милицией", униженные "при задержании" и в каталажках, будут знать, к кому обращаться. Впрочем, об униженных и оскорбленных гражданах речь на слушаниях не шла. Ибо главная цель "мероприятия" была другая — дать отпор Западу, клевещущему на Беларусь, на самом деле являющуюся царством свободы и демократии. Поэтому, естественно, никто не сказал о главном: о том, что Конституция наша — это только декоративный фасад, за которым действуют сыплющиеся на наши головы каждый день бесчисленные указы и декреты президента. Что мы живем не в конституционном, а в авторитарно, самодержавно управляющемся государстве. Что действия высшей власти при нынешнем порядке вещей никак не контролируются обществом. Что в стране действует телефонное право. Что принципиальные судебные процессы под давлением этого права превращаются в фарс (дело Шеремета). Что прозвучавший на слушаниях избитый штамп — "из 1200 периодических изданий только 300 являются государственными" — всего лишь неуклюжая попытка скрыть подлинное положение дел со свободой слова в Беларуси, с настоящим развитием свободных масс-медиа. Естественно, в этих условиях и новая фигура — уполномоченный по правам человека — будет лишь пешкой, призванной маскировать режим.

Да и кто мог об этом сказать, ежели список ораторов, не исключаю, был утвержден свыше. Как говорят грамотные люди из тех же верхов, "согласно сценария". Состоялось очередное пышное пропагандистское шоу "по правам человека". Раньше идеологические пленумы ЦК КПСС посвящались проблеме "воспитания нового человека". Теперь другие времена, и те же люди уже витийствуют о "правах человека". Неискренность устроителей этого шоу видна уже в самой его организации. Ежели бы они были действительно заинтересованы в настоящем, глубоком разговоре, то почему не позвали на слушания и не дали слова лидерам оппозиционных партий, редакторам негосударственных газет, независимым, не поддакивающим власти интеллектуалам, не говоря уже о представителях правозащитных организаций, официально действующих в Беларуси (Хельсинкского комитета и др.)? Что же это за слушания, на которых все время упоминают "так называемую оппозицию", но не желают выслушать другую сторону? Что это за слушания, где нет полемики, нет диалога, а звучит сплошной монолог, хотя и выступило около трех десятков ораторов?

Впрочем, до такой демократии — слушать других, непохожих на нас — мы еще не доросли. Гораздо привычнее образ врага. Не случайно г-н Мясникович извлек из древней идеологической пыли образ Аллена Даллеса, директора ЦРУ времен "холодной войны". Соответственно выступил и г-н Шейман, приведший факты радикализации и роста экстремы в национально-молодежной среде. А кто должен нести ответственность, г-н Шейман, за появление и распространение этих настроений? Вы скажете: конечно, Запад! Он питает, подкармливает экстремистов... Но экстремисты, г-н Шейман, есть даже в демократичнейшей Франции и в благополучнейшей Швейцарии... Кто их там питает? Не Беларусь же! Хотя и СССР был причастен к западной левосоциалистической отрыжке. Но на Западе экстрема — это маргиналы, которым западная же демократия пока дает достойный отпор.

А вот вину за экстрему в белорусской молодежной среде я бы возложил на деятелей нынешнего режима, унижающего национальное достоинство молодых белорусов, неспособного к уважительному диалогу, признающего только один аргумент — грубой силы. Кто не хочет диалога? Власть твердит о "непримиримой оппозиции". Ну, во-первых, в оппозиции тоже разные течения имеются, что вполне закономерно. Но в данном случае не о ней, не о политической только оппозиции, речь. Нет диалога власти с обществом, власти с собственным народом. Вот что еще раз подтвердили парламентские слушания по правам человека. Нынешняя властная бюрократия, как и советская, по-прежнему стоит на своем: есть "правильный народ" и есть "враги". Конечно, занимая такую позицию, невозможно снизойти до элементарного внимания к инакомыслящим. А между тем, у кого больше возможностей для диалога, у этих "инако" или у власти, в руках которой все рычаги и кнопки? Кто должен быть благороднее, великодушнее, умнее, наконец, в чисто практическом смысле?



Сознаю всю наивную риторику этих вопросов. Но ведь другого выхода нет. Революции, гражданские войны — это мы уже проходили. И, кстати, что как не советское понимание истории питает "освободительный романтизм" молодых национал-радикалов? Так что в известном смысле это ваши дети, господа управляющие страной. И этих детей вы тащите в кутузку после митинга только за то, что они говорят по-белорусски. А потом хотите, чтобы они на второй день забыли о кровавых рубцах на спине, нанесенных им палками ваших "блюстителей порядка"? Да еще устраиваете шоу "по правам человека"! После таких "социальных уроков" впору засесть за сочинение "Руководства для молодого конспиратора".

Так кто же провоцирует напряженность в стране? Да и велика ли угроза, г-н Шейман? Я понимаю, ваши службы не спят, хлеб отрабатывают... Но, ей же Богу, неловко становится, когда секретарь Совета безопасности с серьезным видом говорит о некоем конспиративном пособии для молодежи, скрупулезно подсчитывает количество семинаров и конференций "враждебных сил", состоявшихся за рубежом... Полноте, г-н Шейман! Не с вашими штатами людей в пятнистых комбинезонах чего-то бояться! Отравляются, как вы считаете, мозги молодежи? Так откройте для свободной полемики газеты государственные, радио, телевидение! Вы же постоянно говорите о здравом смысле белорусского народа. Чего вы боитесь? Зюганов каждый день по всем телеканалам честит "господина Ельцина", а народ в Москве не идет на баррикады. А на Белорусском телевидении царит только одна поучающая всех голова. И вы хотите такой пропагандой завоевать доверие всей молодежи?

И еще о "врагах". Ну я понимаю: БНФ — это для вас враг № 1. Но ведь экстрема, г-н Шейман, ползет и с другой стороны. Но об этом на слушаниях по правам человека молчат. Я имею в виду черносотенную, антисемитскую пропаганду, процветающую на страницах так называемых "славянских" изданий и пробивающуюся на государственное радио и телевидение. Видимо, эти экстремисты с ксенофобской подкладкой как-то ближе, роднее власти. Потому о них и не было ни слова в докладе г-на Шеймана.

"У нас нет конфликтов на этнической, национальной почве", — этот мотив постоянно звучал на слушаниях. Но это не ваша заслуга, господа из правящих кругов! И нечего этим кичиться. Это наш народ таков. Но под вашим же благосклонным крылом и при вашем "законном" попустительстве уже взращиваются семена зла на национальной почве. Вы тащите в участок Валерия Щукина за публичное требование свободы для Андрея Климова. Но вы молчите, когда "некие неизвестные" избивают кинорежиссера Юрия Хащеватского, автора хорошо вам известного фильма. Вот они, ваши "права человека", так сказать, в действии, а точнее, в их циничной неприглядности.

Я говорю о "ваших правах человека", потому что жизнь наша подтверждает одно: у нас никто сегодня не защищен от произвола власти, власть может сделать с любым человеком все, что угодно, и никакой управы на этот произвол не найти. Суды полностью зависимы от режима. Прокуратура под его же железной пятой. В государственные масс-медиа по действительно серьезному поводу, прежде всего по нарушениям закона со стороны самих властей, обращаться бесполезно.

В этой обстановке, вдобавок осложненной массовым выездом иностранных послов, проведение парламентских слушаний по правам человека — циничнейший спектакль, рассчитанный... На кого? Запад эту пьеску не заметит даже. Значит, для "внутреннего потребления"? Ну что ж, наш народ такой, он и это проглотит... Мало ли про какие "права человеков" начальство толкует. Пенсиюшку бы вовремя получить. Да и ветеранам войны добрый президент только что кусочек подбросил... Вот и все права...

О беспрецедентном нарушении президентом Республики Беларусь А.Лукашенко норм международного права

Заявление Президиума Верховного Совета Республики Беларусь

Искусственно спровоцированный президентом Республики Беларусь А.Лукашенко международный скандал приобрел угрожающий для судеб Беларуси и ее народа размеры. Послы зарубежных стран покидают Беларусь. В свою очередь главам дипломатических миссий Республики Беларусь за рубежом предложено возвратиться в Минск. Ничего подобного не было в международных отношениях даже в худшие времена холодной войны.

Главная причина действий такого рода — в неспособности президентской власти справиться с экономическими и социальными проблемами внутри страны, а также реакция на негативную оценку мировым сообществом политического режима Беларуси.

Беспрецедентные действия А.Лукашенко грубо попирают нормы международного права и нарушают Венскую (1961 г.) конвенцию о дипломатических сношениях. Складывающаяся ситуация чревата тяжелыми политическими и экономическими последствиями для Беларуси: ведет к полной изоляции государства, сокращению инвестиций и объемов внешней торговли, рабочих мест, свертыванию гуманитарной помощи и программ, и в первую очередь оздоровления детей, пострадавших от последствий аварии на Чернобыльской АЭС. Ни с чем не соизмеримо утерянное доверие к стране.

Ни белорусский народ, ни его законно избранные представители — депутаты Верховного Совета Республики Беларусь — не могут нести ответственности за шокирующие мировое сообщество действия президента и его окружения.

Президиум Верховного Совета Республики Беларусь осуждает безответственную акцию А.Лукашенко и от имени белорусского народа приносит извинения народам, правительствам и парламентам государств, имеющих дипломатические представительства в Республике Беларусь.

Принято на расширенном заседании Президиума Верховного Совета Республики Беларусь

23 июня 1998 года.
г.Минск.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №330

Аб матэрыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян у сувязі са святкаваннем Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі)

У сувязі са святкаваннем Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі) **пастанаўляю**:

1. Аказаць матэрыяльную падтрымку:

1.1. у памеры 750 тыс.рублёў — Героям Савецкага Саюза, поўным кавалерам ордэна Славы, а таксама Героям Сацыялістычнай Працы, якія ўдастоены гэтых званняў за заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

1.2. у памеры 500 тыс.рублёў:

удзельнікам і інвалідам Вялікай Айчыннай вайны;

бацькам, дзецям-інвалідам з дзяцінства і не ўступіўшым у новы шлюб жонкам (мужам) ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі або прапалі без вестак у час баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны;

1.3. у памеры 250 тыс.рублёў:

асобам, якія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную ваенную службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

грамадзянам, якія працавалі ў перыяд блакады Ленінграда на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада і ўзнагароджаны медалём "За абарону Ленінграда", а таксама грамадзянам, якія ўзнагароджаны знакам "Жыхару блакаднага Ленінграда";

былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і былым непаўналетнім вязням іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашысцкай Германіяй і яе саюзнікамі ў перыяд другой сусветнай вайны;

інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі і калецтва, якія звязаны з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з іх вынікамі;

пенсіянерам, якія дасягнулі ўзросту 100 і больш гадоў.

2. Фінансаванне расходаў на аказанне матэрыяльнай падтрымкі грамадзянам, якія пералічаны ў пункце 1 гэтага Указа, ажыццявіць за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства сацыяльнай абароны, атрыманых ад капіталізацыі.

Міністэрству сацыяльнай абароны забяспечыць своечасовае выдзяленне неабходных сродкаў.

3. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам правесці выплату грашовых сродкаў грамадзянам, якія пералічаны ў пункце 1 гэтага Указа, у перыяд з 25 чэрвеня па 25 ліпеня 1998 г.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А.Лукашэнка.
23 чэрвеня 1998 г.
г. Мінск.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №329

Аб стварэнні дзяржаўнай камісіі для ажыццяўлення кантролю за работай прыёмных камісій і правядзеннем уступных экзаменаў

У мэтах забеспячэння роўных магчымасцей абітурыентам пры паступленні ў дзяржаўныя вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы **пастанаўляю**:

1. Стварыць дзяржаўную камісію для ажыццяўлення кантролю за работай прыёмных камісій і правядзеннем уступных экзаменаў у дзяржаўных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах у 1998 годзе.

Назначыць старшынёй гэтай камісіі Дамашкевіча М.Ф., Старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, намеснікам старшыні камісіі — Русакевіча У.В., першага намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, даручыўшы ім унесці Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь да 25 чэрвеня 1998 г. прапановы па персанальнаму складу камісіі і яе паўнамоцтвах.

2. Правядзенне ўступных экзаменаў у дзяржаўных вышэйшых навучальных установах пачаць у ліпені 1998 г. з пісьмовых кантрольных работ па беларускай (рускай) мове, тэмы якіх аб'яўляюцца па тэлебачанню і радыё.

3. Дзяржаўнай камісіі, створанай у адпаведнасці з гэтым Указам:

па выяўленых фактах парушэнняў правіл прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы аператыўна прымаць прадугледжаныя заканадаўствам меры;

арганізоўваць у сродках масавай інфармацыі асвятленне ходу правядзення ўступных экзаменаў і работы дзяржаўнай камісіі;

справаздачу аб рабоце дзяржаўнай камісіі прадставіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь да 1 верасня 1998 г.

4. Гэты Указ увесці ў дзеянне з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка.
23 чэрвеня 1998 г.
г. Мінск.

На фасадзе Нацыянальнага мастацкага музея з'явілася імя, дастойнае прадоўжыць яго назву

Падзея, якую даўно чакалі. Так зусім апраўдана можна назваць цырымонію адкрыцця мемарыяльнай дошкі ў памяць аб заслужаным дзеячы мастацтваў Беларусі Алене Васільеўне Аладавай. З гэтага часу кожны, хто ўваходзіць у Нацыянальны мастацкі музей, будзе ведаць, што заснавальнікам яго калекцыі была менавіта гэта жанчына. Яна ж доўгі час — з 1944 па 1977 год — узначальвала мастацкі музей, прыклала нямала сіл для таго, каб у 1957 годзе ў яго з'явіўся дастойны будынак у цэнтры Мінска.

Не першы год вядомыя мастакі і дзеячы культуры нашай краіны хадайнічаюць аб прысваенні музею імя Алены Аладавай. Такая прапанова не раз гучала і на цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі, якую бязвыплатна стварылі скульптар Іван Міско і архітэктар Міхаіл Ткачук. Як адзначыла ў інтэрв'ю карэспандэнту БелТА дачка Алены Васільеўны Радаслава Аладава, на жаль, час бярэ сваё, і ўсё менш застаецца жывых сведак той сапраўды тытанічнай працы, якую зрабіла яе маці, ствараючы мастацкі музей — гордасць нашай краіны. З'яўленне мемарыяльнай дошкі каля ўваходу ў яго, безумоўна, дапаможа захаваць памяць пра гэтага выдатнага чалавека.

Тыя, каму пашчаслівілася працаваць разам з Аленай Аладавай, не скупіліся на пахвалы ў яе адрас. Яна працавала, не шкадуючы сябе, часта без выхадных і нават па начах. Склаўшы з сябе ў сямідзесяцігадовым узросце дырэктарскія паўнамоцтвы, Алена Васільеўна яшчэ амаль дзесяць гадоў — да самай смерці — працягвала працаваць у музеі старшым навуковым супрацоўнікам і кансультантам.

У цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі прынялі ўдзел міністр культуры Беларусі Аляксандр Сасноўскі, старшыня Беларускага саюза мастакоў Генадзь Буралкін, славутыя майстры выяўленчага мастацтва, родныя і блізкія Алены Аладавай. А ўсе прынесеныя кветкі засталіся каля ўваходу ў музей, прыцягваючы ўвагу шматлікіх прахожых. Можа, хтосьці з іх "лішні раз" загляне ў вольны час і ў сам будынак?

Віктар КУКЛОЎ,
БелТА.

Цитата дня

В наше время, когда журналистская профессия порой разъедается политической конъюнктурой и конформностью, принципиальная и серьезная позиция газеты вызывает уважение.

(Из поздравления президента Республики Беларусь А.Лукашенко газете "Советская Белоруссия")

Громкое дело

Очередное свидание в СИЗО парламентария Андрея Климова с родственниками, которое должно было быть 22 июня 1998 года, не состоялось.

Запретил встречу следователь Кужель. Более того, по словам жены депутата Верховного Совета Татьяны Леонович, он заявил, что вообще больше никогда свидания с депутатом Климовым не даст.

Переживания матери и жены за состояние здоровья родного человека, проведшего в тюремных стенах уже две голодовки протеста, полковнику Кужелю доставляют, видимо, моральное удовлетворение. Может быть, потому, что других успехов в данном деле за четыре с половиной месяца содержания под стражей Климова не достигнуто.

Собственно, откуда им быть? Ведь у нынешних белорусских следователей в основе системы получения от подозреваемых показаний лежит метод сталинских энкавэдистов: признание — царица доказательства. На Беларуси, как и в 37-м году, нужного человека вначале арестовывают, затем заставляют его подписать документ об отказе от услуг адвоката, а после из подследственного начинают выбивать, в самом прямом смысле этого слова, признания в совершении преступления.

Если это не так, то пусть полковник Кужель подаст на меня в суд. Я готов в ходе судебного процесса представить соответствующие доказательства. Но только ведь тогда очень многие его подчиненные поменяются местами с теми заключенными, которые осуждены на основании выбитых показаний. Да и самому начальнику следственного управления, не способному за более чем четырехмесячный срок содержания под стражей Андрея Климова представить обвиняемому доказательства совершения им умышленного преступления, пора, кажется, сушить сухари и готовиться заменить депутата законодательного органа на койке в СИЗО.

Выбивать показания из белорусского парламентария, учитывая его статус и неизбежность международной огласки, полковник Кужель не решается. Да и что можно выбить из человека, который никогда не станет на себя наговаривать?

Валерий ЩУКИН,
секретарь Комиссии по национальной безопасности, обороне и борьбе с преступностью Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва.

Скандал недели

Дрозды опустели — послы улетели...

22 июня 1998 года шесть послов государств Европейского Союза — Великобритании, Германии, Франции, Италии и Греции — и Соединенных Штатов Америки вылетели из Минска на самолете в свои страны на неопределенный срок для консультаций. Проблема ремонта коммуникаций в комплексе "Дрозды", где проживали семьи иностранцев, привела к политическому скандалу, невиданному в новейшей истории дипломатии. Из-за рубежа начался исход послов Беларуси обратно в Минск.

Параллели

Канализация, канава, караул — "враги" отброшены за Неман и за Буг

Так уж совпало, что в тот скандальный день программа белорусского телевидения "Телебарометр" напомнила исторический факт: 22 июня 1812 года Наполеон отдал французской армии приказ форсировать Неман и вторгнуться в славянские земли. Много воды утекло с тех пор в батюшке-Немане, пока не смыла она бесследно порожденную войной вражду народов.

22 июня 1941 на рассвете немецкие войска пересекли Буг и передовые части вооруженных до зубов гитлеровцев обрушили шквал огня на Брестскую крепость. Еще больше воды утекло в белорусско-польской речке Буг, прежде чем унесла она в невозвратное прошлое ненависть между различными нациями. Спустя 57 лет на всем пространстве СНГ народы отмечали День скорби.

22 июня 1998 года сыскался в мире новый "воитель", который на исходе XX века коварным стремительным ударом враз "разделался" со всеми как бы обидчиками "французами" и "немцами", а заодно с "англичанами" и "итальянцами", и даже с сугубо мирными "греками" и уж конечно с "янки", которые слишком много о себе понимают...

В самый длинный день в году лета 1998-го от рождения Христова президент Беларуси по необузданной своей воле лихо отбросил за Неман и Буг цивилизованную Европу и демократические Соединенные Штаты Америки.

В этой более чем "странной войне" против иноземного дипломатического корпуса, защитой которому служила лишь принятая между народами мира Венская конвенция о представительствах, власти республики применили сварочные аппараты, экскаваторы, электровыключатели, водопроводные вентили. В жилищах послов отключили воду и свет, одни ворота в поселок Дрозды заварили, на другом проезде дорогу перекопали, выставили милицейские караулы — и представители просвещенных наций дрогнули перед беспримерной наглостью, цинизмом и хамством.

В чем коренные причины вспыхнувшей конфронтации? Они действительно опасны для судеб мира, потому что базируются на мрачной мотивации единовластного правителя. О Дроздах Александр Лукашенко публично заявил, что "это моя резиденция". Российские телеканалы сообщили, что президент заподозрил в шпионаже американского посла, ближнего соседа по Дроздам. Прочих дипломатов огулом зачислили в разряд "врагов белорусского народа"...

Такого рода черные побуждения — захватить, изгнать, уничтожить — не раз приводили к развязыванию страшных войн на планете. Из года в год напоминает об этом исторически печальная дата 22 июня.

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли".

Заява Выканкама Цэнтральнай Рады БСДГ

Беларуская Сацыял-дэмакратычная Грамада выказвае рашучы пратэст супраць чарговай спробы ўладных структур знішчыць адзін з апошніх астраўкоў беларускасці ў рэспубліцы — Беларускі гуманітарны ліцэй. На гэты раз выбраны новы "падыход" — праз аб'яднанне з рускамоўным ліцэем пры БДУ. Арганізатары гэтай ганебнай акцыі агульнавядомыя. Іх не спыняе нават адказнасць за парушэнне канстытуцыйных правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Выканкам ЦР БСДГ выказвае сваю салідарнасць з навучэнцамі ліцэя і іх бацькамі, выкладчыкамі Беларускага гуманітарнага ліцэя ў іх барацьбе за права атрымліваць адукацыю на роднай мове.

Рукі прэч ад ліцэя!

Чэрвеньская стыхія не толькі нанесла Беларусі велізарны матэрыяльны ўрон, але і забрала чалавечыя жыцці

Уздзеянню рэзкіх ваганняў тэмпературы паветра, ліўневых дажджоў і шквальных вятроў падвяргалася тэрыторыя нашай рэспублікі на працягу чэрвеня. У выніку пацярпелі 42 раёны. І самае страшнае — ад удараў маланак і траўм загінулі сем чалавек.

У раёнах Гомельскай вобласці была адзначана скорасць ветру, роўная 28 метрам у секунду, а на метэастанцыі ў Горках — 32 метрам. Найбольш пацярпелі Гомельская, Магілёўская, Віцебская і Мінская вобласці. Паводле папярэдніх даных, страты ў сельскагаспадарчай вытворчасці краіны склалі больш чым 1,3 трыльёна рублёў.

Як паведамілі БелТА ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, пашкоджанні пасеваў, дахаў, вокнаў жылых, грамадскіх і сельскагаспадарчых пабудоў, сістэм электразабеспячэння і сувязі былі выкліканы шквальнымі ветрамі, ліўневымі дажджамі з градам. Нягледзячы на тое, што гэтыя пашкоджанні мелі лакальны характар, асобным гаспадаркам нанесены значны матэрыяльны ўрон, асабліва ў Лельчыцкім і Мазырскім раёнах.

У прыватнасці, у Лельчыцкім раёне за двое сутак выпала 90,5 міліметра ападкаў пры месячнай норме 76. Ліўневы дождж суправаджаўся градам дыяметрам да 30 міліметраў. Падтоплена каля 200 падвор'яў і звыш 16 тысяч гектараў сельгасугоддзяў.

Ад шквальнага ветру ў Мазырскім раёне пацярпелі вёскі Васькаўка, Гостаў і дачны пасёлак Вялікае зімоўе. Знішчана каля 900 гектараў лесу, выйшла са строю 50 кіламетраў ліній электраперадач, завалена тры кіламетры дарог. Усяго пашкоджана 76 жылых дамоў, шэсць з якіх у вёсцы Васькаўка не прыгодныя для пражывання.

Паводле даных спецыялістаў, на аднаўленне пашкоджаных і разбураных будынкаў, збудаванняў і камунікацый запатрабуецца каля 100 мільярдаў рублёў. Для ліквідацыі вынікаў стыхіі задзейнічана больш як шэсць тысяч чалавек і амаль 800 адзінак тэхнікі. Камісіямі па надзвычайных сітуацыях аблвыканкамаў і райвыканкамаў арганізавана работа па аднаўленні ў першую чаргу сістэм жыццезабеспячэння, жылых і вытворчых пабудоў. У выніку прынятых мер большая частка жылых дамоў і вытворчых памяшканняў, пашкоджаных ліній сувязі і электразабеспячэння ўжо адноўлена. Вуліцы вёсак і дарог расчышчаны ад завалаў.

БелТА.

Роздум

Колькі каштуе беларускае слова?

За апошнія 2—3 гады зноў у чарговы раз рэзка ўпала ў цане беларуская нацыянальная ідэя. У чым прычына гэтага? Корань праблемы — у заняпадзе беларускай мовы ў цэлым і ўсіх яе мясцовых дыялектаў — у прыватнасці.

Якую ролю яны маюць у жыцці чалавека? Адказ на гэтае пытанне дае аналіз доследаў маскоўскага вучонага з Інстытута квантавай генетыкі Пятра Пятровіча Гараева, аб якіх ён паведаміў у канцы 1995 года на хвалях Радыё-1 і Астанкіна ў перадачах "Веру — не веру". Паводле яго звестак, мова з'яўляецца адным з асноўных механізмаў у настройцы арганізма ў рэзананс з навакольным асяроддзем. А як вядома, усё ў сонечнай сістэме знаходзіцца ў рэзанансным стане, што з'яўляецца асновай яго ўстойлівага існавання. Гэта адносіцца і да чалавека, які з'яўляецца часткай гэтай сістэмы.

У сваіх доследах Гараеў паказаў, што малекулы ДНК, у якіх захоўваецца ўся генетычная інфармацыя, маюць імгненную і адназначную рэзанансную рэакцыю на родную мову. Аднак на гэтую частку яго работы вучоныя і спецыялісты не звярнулі ўвагі. А шкада!

Калі ўзяць гэты раздзел за аснову, то роля мовы з абстрактнага значэння пераходзіць у разрад аднаго з галоўных паказчыкаў у здароўі чалавека!

Таму, каб людзі былі здаровымі, трэба вельмі старанна захоўваць усе моўныя дыялекты на іх родных месцах, як і мову родную ў цэлым. Кожнае слова, напісанае нашымі пісьменнікамі на роднай мове, павінна быць прачытана (і не раз), і разглядацца, напрыклад, як дрэва ў лесе, якое дае карысць усяму навакольнаму, пакуль жыве. І тады з'явіцца новая цана роднаму слову — не рынкавая, а гістарычная і зусім рэальная.

Яе можна будзе вызначыць, калі весці статыстыку стану здароўя людзей у залежнасці ад пастаяннага пражывання на месцы нараджэння з роднаю моваю. Думаю, што гэта будзе пацверджана вельмі належным чынам, і гэта стане рэальнай асновай для беларускай нацыянальнай ідэі, а беларуская мова на Беларусі стане натуральна галоўнай, панавальнай!

Валянцін КЛЯПКО.
г.Бабруйск.

Надвор'е

27 і 28 чэрвеня на тэрыторыі рэспублікі воблачна з праясненнямі. 27-га ўначы без ападкаў, удзень — на крайнім захадзе, 28-га — месцамі па рэспубліцы кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 27-га — +4...+9, 28-га — +7...+12; удзень — +18...+23; 28-га па поўдні да +25.

Ліст на Радзіму

Крамола?

У практыцы перлюстрацый маёй пошты я заўважыў дзіўную заканамернасць. Ніводны ліст да сяброў на Беларусь не дайшоў — выключэнне было зроблена толькі для халодных віншавальных паштовак. Магчыма, ці маіх знаёмых бароніць ад "дурнога ўплыву" (хаця я не пішу сябрам пра палітыку), ці проста пакасіць па-дробнаму. Аднак усё, што дасылаю бацькам, ці што дасылаюць яны — ідзе спраўна. Тое ж тычыцца і жонкі: не лісты да сяброў не даходзяць, а вось да бацькоў — не згубіўся ніводны. Пры гэтым пакет з Віцебска ў Нью-Йорк часам ідзе толькі пяць дзён, што, безумоўна, робіць гонар беларускай паштальёнаў (я цудоўна разумею, што не яны "губляюць" астатнія лісты). Словам, мне цяжка патлумачыць логіку тых, хто ўладае заданы.

Але як толькі я паспрабаваў укласці ліст да бацькі ў канверт, выпушчаны Радыё БНР да 80-годдзя ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі — мне яго вярнулі (праз Юрыя Хадыку перадаю гэты канверт у рэдакцыю). Як сведчыць штэмпель, з Нью-Йорку ліст выйшаў, ну а да Віцебска не дайшоў, хаця і адрас напісаны дакладна (прычым не толькі па-беларуску, але і па-англійску), і марак наклеена болей, чым патрабуецца.

Бачу толькі адну прычыну: кожную выяву "Пагоні" і бела-чырвона-белага сцяга на тэрыторыі Беларусі — ці то на канверце, ці то ў кнізе, ці то на значку — рэжым успрымае не інакш як крамолу, але і як небяспеку свайму існаванню.

Сяргей НАВУМЧЫК.
Нью-Йорк.

Письмо Хиллари Клинтон матерям и женам белорусских политзаключенных

Директор отдела Госдепартамента США по Беларуси, Украине и Молдове Джек Сегал 25 июня в американском посольстве вручил матерям и женам белорусских политзаключенных письмо от первой леди США Хиллари Клинтон, адресованное женщинам Беларуси. Это послание является ответом на письмо, переданное г-же Клинтон 6 мая членом оргкомитета Хартии-97 Людмилой Грязновой, а также Галиной Сивчик, Раисой Шидловской, Эдвигой Лабкович, Татьяной Северинец и Людмилой Шеремет. В нем женщины призвали Хиллари Клинтон поддержать их усилия в правозащитной деятельности и установлении демократии на Беларуси.

Ответ от г-жи Клинтон вместе с приглашением в посольство на празднование Дня независимости США получили Людмила Грязнова, Людмила Шеремет, Галина Сивчик, Раиса Шидловская, Татьяна Климова и Татьяна Северинец. В беседе с белорусскими женщинами было отмечено, что американская сторона готова проработать вопрос об их личной встрече с первой леди США.

Текст письма прилагается полностью.

Пресс-центр Хартии-97
25 июня 1998 года.

5 июня 1998 г.

Дорогие женщины Беларуси!

Благодарю вас за письмо из Минска. Я с большой теплотой вспоминаю наш с Президентом Клинтоном визит в Беларусь в январе 1994 г.

Ухудшение положения с соблюдением прав человека в Беларуси вызывает озабоченность у каждого, кого волнуют права личности и семьи на достойную, безопасную и свободную жизнь. Вы ощутили на себе, каким болезненным и разнообразным может быть нарушение прав человека властями. То, что вам приходится пережить сегодня, может завтра выпасть на долю других людей.

Но в своей борьбе вы не одиноки. Соединенные Штаты остаются приверженными делу защиты прав человека в Беларуси. Это направление остается главным для Посла Спекхарда и Посольства США в Минске. Я призываю вас поддерживать с ними тесный контакт.

Ваши мужественные усилия в защиту основных прав человека в Беларуси вызывают восхищение. Я желаю вам, вашим мужьям, сыновьям и другим дорогим вам людям оставаться в это тяжелое время сильными.

С наилучшими пожеланиями остаюсь
искренне ваша,

Хиллари Родэм Клинтон.

Сделаем жизнь светлее

Медленными, но уверенными шагами идет развитие отечественного бизнеса. Повышению его уровня способствуют многие отрасли, среди которых главенствующую позицию занимает строительство. Хотелось бы рассказать об одном его направлении — светотехнике — и о производственной фирме "Кальченко и К^{0}". Фирма основана в 1995-м и за три года активной работы стала известна не только у нас в стране, но и за ее пределами.

На сегодняшний день к "Кальченко и К^{0}" обратились более шести тысяч потребителей осветительной и электротехнической продукции. Основными клиентами фирмы являются заводы, строительные организации, коммерческие и государственные структуры. Среди них такие известные компании, как "Таир", "Трайпл", "Крыница", "Форд", "Кока-кола", "Макдональдс", а также гостиницы, бары, рестораны, дискотеки. Колхозы и совхозы, которые закупают здесь в зимний период инфракрасные лампы для обогрева животных, также являются постоянными заказчиками.

Успех предприятия заключается в сотрудничестве с крупнейшими производителями светотехнического оборудования, среди которых такие известные фирмы, как "Radium", "Philips", "General Elektric", "Osram", "Elgo". Фирмой, кроме того, организовано собственное производство светильников и прожекторов.

В уютном офисе фирмы на Орловской работа, что называется, кипит. Сотрудники относятся к делу профессионально и с воодушевлением. Любого, кто обратится сюда, не оставят без внимания ни на минуту, дадут полную информацию по интересующему вас вопросу, сделают все, чтобы вы остались довольны полученным товаром. "Кальченко и К^{0}" — не только отличное качество продукции и низкие цены, но и высокий уровень сервиса, над усовершенствованием которого все постоянно работают. Обслуживание идет по четко налаженному графику, чему в немалой степени способствует тот факт, что склад находится рядом с офисом на удобно расположенной магистрали недалеко от центра столицы. За товаром вы можете прислать и легковушку, и фуру. Продукцию можно получить по чековой книжке, а в случае отсутствия на складе необходимого товара вам предложат оформить заказ, который будет выполнен в максимально короткие сроки.

Светильник РСП и прожектор ПЗМ — продукция фирмы "Кальченко и К^{0}"

Ассортимент продукции, предлагаемой "Кальченко и К^{0}", очень широк: прайс-лист включает более тысячи наименований. Фирма способна удовлетворить любые запросы — поставляет офисные светильники, большой ассортимент для производственных помещений и уличного освещения, бактерицидные лампы — для медицинских учреждений, прожекторы. Здесь есть любые лампы — от бытовых до специального назначения. Для энергетиков существует широкий выбор разнообразной электротехнической продукции, среди которой силовая, пускорегулирующая аппаратура, кабель и многое другое. Фирма стремится к тому, чтобы о ней говорили: "У Кальченко все есть".

Архитекторам и проектировщикам фирма с удовольствием предложит каталоги продукции зарубежных заводов-изготовителей осветительной продукции, а также готова осуществить комплектацию объектов — от силового кабеля до выключателя. Фирма выполняет не только крупнооптовые заказы, но и более мелкие.

Несмотря на очевидные успехи, "Кальченко и К^{0}" не останавливается на достигнутом. Фирма активно развивается, практически каждую неделю вводятся какие-то новшества. Например, к трехлетию фирмы открылся новый выставочный зал.

Все мы хорошо знаем, как приятно иметь дело с надежной фирмой, которая заботится о своем престиже не на словах, а на деле, которой можно доверять. "Кальченко и К^{0}" относится именно к таким организациям. Обращайтесь к "Кальченко и К^{0}, и вы убедитесь в этом сами.

Подготовила Екатерина МИСТЮК.

Нацыянальны банк Беларусі растлумачвае банкам правядзенне асобных аперацый з нерэзідэнтамі з выкарыстаннем вэксаляў

Нацыянальны банк Беларусі накіраваў у банкі рэспублікі ліст з растлумачэннямі асобных аперацый банкаў з нерэзідэнтамі з выкарыстаннем вэксаляў. У лісце, у прыватнасці, паведамляецца, што ў выпадку, калі ўтрымальнікам вэксаля банка, наміраванага ў беларускіх рублях, з'яўляецца нерэзідэнт, аплату свайго вэксаля ў валюце намінала банк робіць у тым выпадку, калі заканадаўствам рэспублікі дапускаецца такая магчымасць. Калі ж банкам на вэксалі зроблена агаворка, што плацеж павінен быць ажыццёўлены ў канкрэтна ўказанай валюце, напрыклад, у беларускіх рублях, то аплату такога вэксаля банк робіць толькі ў гэтай валюце, у прыватнасці, у беларускіх рублях.

Апрача таго, НБ паведамляе, што продаж банкам замежнага вэксаля, наміраванага ў СКВ, нерэзідэнту робіцца за валюту намінала або іншую СКВ. Продаж банкам замежнага вэксаля, наміраванага ў замежнай валюце, апрача СКВ, нерэзідэнту можа ажыццяўляцца за валюту намінала вэксаля, калі заканадаўствам рэспублікі дапускаецца магчымасць правядзення разлікаў з гэтым нерэзідэнтам у валюце намінала або за СКВ.

У лісце паведамляецца, што продаж нерэзідэнту замежнага вэксаля, наміраванага ў беларускіх рублях, ажыццяўляецца толькі за валюту намінала вэксаля.

Ягор ЗВОННІКАЎ, БелаПАН.

На перамовах у Мінску транспартнікі Беларусі і Даніі зацвердзілі квоты дазволаў на праезд перавозчыкаў па тэрыторыі дзвюх дзяржаў

У гэтым годзе квота для беларускіх аўтамабільных перавозчыкаў на праезд па тэрыторыі Даніі вызначана ў памеры 900 універсальных і 800 дазволаў з правам выезду ў трэція краіны. Дамоўленасць аб гэтым дасягнута ў Мінску на пасяджэнні камісіі па пытаннях міжнародных аўтамабільных зносінаў з удзелам дэлегацыі Міністэрства транспарту Даніі і Дацкай нацыянальнай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў. З беларускага боку ў працы пасяджэння ўзялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства транспарту і камунікацый, а таксама Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў.

Як паведамілі БелаПАН у Міністэрстве транспарту, дацкі бок пагадзіўся дадаткова выдзеліць беларускім перавозчыкам на гэты год 200 дазволаў на выезд у трэція краіны. Транспартнікі Беларусі і Даніі таксама папярэдне дамовіліся аб захаванні квоты дазволаў 1998 года на 1999-ы. Былі абмеркаваны і іншыя пытанні, датычныя развіцця транспартных зносінаў паміж дзвюма дзяржавамі.

Нагадаем, што колькасць паездак беларускіх перавозчыкаў у Данію з кожным годам узрастае прыблізна ў 1,5-2 раза, у той час як цікавасць дацкіх перавозчыкаў да Беларусі паступова згасае. У 1997 годзе беларускія перавозчыкі ажыццявілі 805 паездак па тэрыторыі Даніі; дацкія перавозчыкі па тэрыторыі Беларусі — 242 паездкі.

Аляксей АРЭШКА, БелаПАН.

Па рашэнні Мінскага абласнога гаспадарчага суда з арандаванага памяшкання высяляюць Таварыства беларускай мовы

25 чэрвеня ў 11 гадзін раніцы работнікі Жыллёвага рамонтна-эксплуатацыйнага ўпраўлення Партызанскага раёна Мінска пачалі выносіць рэчы з памяшкання Таварыства беларускай мовы (ТБМ).

Гэта адбываецца ў сувязі з рашэннем Мінскага абласнога гаспадарчага суда, які 13 мая пастанавіў спагнаць з ТБМ за даўгі 540 мільёнаў рублёў і выселіць арганізацыю з займаемага ёю памяшкання. На гэтае рашэнне была пададзена скарга старшыні абласнога суда Рыгору Маркоўскаму. Аднак, нягледзячы на тое, што яна дагэтуль не разгледжана, высяленне ТБМ ужо пачалося.

На думку старшыні таварыства, вядомага паэта Беларусі Генадзя Бураўкіна, да разгляду ўсіх скаргаў у судовых інстанцыях праводзіць высяленне незаконна. У гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН Бураўкін паведаміў, што ТБМ арганізавана ў 1989 годзе пры актыўнай падтрымцы тагачасных беларускіх улад. "Гэтае памяшканне нам дала дзяржава, — сказаў ён, — але з цягам часу стаўленне да ТБМ змянілася: яшчэ да таго, як я стаў старшынёй таварыства, нас літаральна прымусілі падпісаць кабальны дагавор, па якім за 1 кв.м мы павінны плаціць 10 долараў штомесяц. Для нашай небагатай арганізацыі, якая існуе за кошт членскіх узносаў і добраахвотных ахвяраванняў, гэта непасільная сума. Дзяржава нам зараз не дапамагае". Трэба адзначыць, што напярэдадні Г.Бураўкін звяртаўся з просьбай аб дапамозе да старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміра Ярмошына і намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Івана Пашкевіча, а яшчэ раней, да суда, — да прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Адказу на ліст да прэзідэнта дагэтуль няма.

Кіраўнік ТБМ расцаніў факт высялення як "паказальнае стаўленне цяперашніх улад да беларускай мовы і культуры". "Мы не хацелі прыцягваць да нашых праблем шырокай грамадскай увагі, — сказаў ён. — Не хацелі нейкага канфлікту з уладамі... Але цяпер мы звернемся да грамадскасці Беларусі і розных міжнародных арганізацый, каб прыцягнуць як мага больш увагі да дыскрымінацыі беларускай мовы і культуры, а таксама тых людзей і арганізацый, якія прапагандуюць і абараняюць іх".

БелаПАН.

У свеце

У Швецыі можна лячыцца і па тэлефоне

У Швецыі даўно ўжо існуе медыцынская тэлефонная служба. Дзякуючы ёй, можна кругласутачна атрымаць кваліфікаваныя парады ў сувязі з узнікшымі праблемамі са здароўем.

Вядома, тэлефонныя кансультацыі не могуць замяніць паўнацэннае лячэнне, аднак яны дапамагаюць чалавеку своечасова разабрацца ў сімптомах захворвання. Па тэлефоне можна атрымаць параду, да якога спецыяліста звярнуцца або як лячыцца самому.

Медыцынская тэлефонная служба дае магчымасць шведскай сістэме аховы здароўя зэканоміць шмат часу і вялікую колькасць грошай, не кажучы ўжо аб тым, што для многіх пацыентаў упэўненасць у тым, што яны ў любую мінуту могуць пагаварыць з медыцынскім персаналам, мае заспакаяльнае і нават лячэбнае дзеянне.

Як стала вядома карэспандэнту БелТА, сёлета вырашана павялічыць колькасць персаналу ў медыцынскай тэлефоннай службе і зрабіць яе бясплатнай. З любога тэлефона, што знаходзіцца ў Швецыі, цяпер можна будзе званіць кругласутачна і бясплатна для атрымання у выпадку неабходнасці кансультацый медработніка.

Інэса МОІН, БелТА.
Стакгольм.

Сітуацыя

Сустрэча былых партызан можа не адбыцца

